зеркало, бесстрастно отражающее все вокруг. Школьник или студент проигрывают множество ролей, становясь великими математиками, известными физиками или поэтами, представителями духовенства или воинами. Это есть деятельностный подход в воспитании и обучении, именно он является наиболее эффективным и действенным. Каждый творчески работающий учитель обязательно передает на уроке часть своих профессиональных функций ученикам. Ученик на время тоже становится педагогом, а следовательно, и носителем норм педагогической этики.

**М.В.Мішкевіч**, *дацэнт*
*(Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт)*

## Стымуляванне творча-пазнавальных матываў пры выкладанні замежных моў

У сучасных псіхолага-педагагічных і метадычных даследаваннях структуры дзейнасці чалавека нязменна падкрэсліваецца неабходнасць усямернага развіцця яе матывацыйна-пазнавальнага аспекту. Павышэнне эфектыўнасці падрыхтоўкі студэнтаў у галіне замежных моў прадугледжвае стварэнне і ўмелае выкарыстанне пазнавальных матываў як у змястоўным, так і ў арганізацыйна-метадычным баку выкладання прадмета. Найбольш поўна гэтыя матывы ажыццяўляюцца пры ўмове прафесійнай накіраванасці навучання.

Пад прафесійнай накіраванасцю выкладання замежных моў у вышэйшай навучальнай эканамічнай установе мы разумеем выкарыстанне ў навучальным працэсе вучэбных матэрыялаў як агульнаэканамічнага характару, так і тэкстаў па прафілюючых спецыяльных дысцыплінах. Акрамя гэтага, прадугледжваецца ўжыванне формаў і метадаў, што развіваюць уласна эканамічнае мысленне студэнтаў і пашыраюць іх агульны светапогляд і кругагляд.

Спосабы стымулявання навучальнай дзейнасці вызначаюцца:

спецыфікаю прадмета;

індывідуальнымі асаблівасцямі навучэнцаў;

метадычным майстэрствам выкладчыка.

Спецыфіка замежнай мовы як прадмета ў эканамічнай установе заключаецца ў тым, што ён з'яўляецца сродкам, з дапамогаю якога можна пашырыць прафесійную падрыхтоўку будучага спецыяліста-эканаміста шляхам далучэння яго да навейшых дасягненняў у абранай спецыяльнасці.

У якасці асноўных чыннікаў фармавання станоўчага стаўлення да вывучання замежнай мовы выступаюць:

змест вучэбных матэрыялаў, якія павінны адбірацца з улікам іх практычнай значнасці і псіхалагічнай успрымальнасці для навучэнцаў;

канкрэтныя спосабы навучальна-пазнавальнай дзейнасці.

Працэс арганізацыі камунікатыўна-пазнавальнай дзейнасці выклікае пэўныя эмоцыі:

эстэтычныя (прыемныя перажыванні адкрыцця цікавага);

інтэлектуальныя (радасць пазнання новага);

маральныя (задавальненне ад пачуцця дасягнення пастаўленай мэты).

Гэтыя эмоцыі складаюць, на наш погляд, ядро ўсялякай пазнавальнай дзейнасці чалавека.

Усё тое, аб чым ішла гаворка, вымушае выкладчыка замежных моў ужо на этапе падбору і пярвічнай апрацоўкі навучальных матэрыялаў забяспечыць іх навізну, яскравасць, нешаблоннасць, сувязь з прафесійнымі інтарэсамі і вопытам навучэнцаў. Акрамя гэтага, навучальныя матэрыялы павінны адпавядаць агульнаметадычным патрабаванням паслядоўнасці, тэрміналагічнай і сэнсавай пераемнасці, паступовага павелічэння цяжкасцяў. Неабходна таксама ўлічваць лагічную структуру прафілюючых дысцыплін.

Апошняе дасягаецца шляхам дасканалага вывучэння стандартаў і кваліфікацыйных характарыстык спецыялістаў, мэтавых установак і зместу вучэбных планаў, патрабаванняў навучальных праграмаў па прафілюючых дысцыплінах, а таксама праз выяўленне таго аб'ёму і зместу навуковай інфармацыі, што можа быць прапанавана студэнтам для вывучэння на замежнай мове паралельна з асноўнымі (спецыяльнымі) курсамі.

Асаблівая роля ў развіцці пазнавальна-творчых здольнасцяў студэнтаў падчас выкладання замежных моў належыць праблемнаму навучанню, у аснове якога ляжаць:

выкарыстанне праблемных заданняў і сітуацый;

прыцягненне студэнтаў да актыўнага ўдзелу ў вырашэнні гэтых праблемных заданняў і сітуацый;

набыццё студэнтамі ўменняў і навыкаў, што неабходны для творчага ўжывання імі набытых ведаў.

**В.С.Тонкович**, *профессор*
*(Белорусский государственный экономический университет)*

## Проблемы интенсификации познавательной деятельности студентов

Интенсификация процесса подготовки специалистов в БГЭУ является главным направлением деятельности трудового коллектива как единственно возможного средства повышения качества образования и воспитания. Наряду с этим важное значение имеет интенсификация познавательной деятельности студентов как решающее условие активизации качества их самостоятельной работы и повышение на этой основе качества подготовки специалистов.

Познавательная деятельность студентов включает в себя: реали-